Жыві, Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

№ 111 (124) 11 чэрвеня 1991 г. Аўторак.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

Факты Аргументы Комментарии Суждения

Будем торговать?

Вчера по приглашению белорусской стороны в столицу республики прибыл посол Республики Корея в СССР Гон Ро Мён. В этот же день короткую беседу с ним имел Председатель Верховного Совета БССР Н. И. Дементей.

По словам Николая Ивановича, цель визита южнокорейского посла — установление контактов для сотрудничества между Южной Кореей и Белоруссией, в частности, в сфере торговли.

Сегодня Гон Ро Мён встречается с Председателем Совмина республики В. Ф. Кебичем.

Избави, Боже, от лукавого

ГОМЕЛЬ (А. Готовчиц). **Кажется, учение Христово о добре и благодетели входит понемногу и в коммерческую жизнь. Думать так заставляет освящение иереем Петропавловского собора отцом Георгием Государственного коммерческого промышленно-строительного банка.**

Напутственное слово касалось благодати в душе человека, который честно исполняет свой профессиональный долг.

Церемония с участием служителей собора Петра и Павла, на реставрацию которого банк в свое время пожертвовал 30 тысяч рублей, состоялась по случаю обретения нового статуса бывшим областным Промстройбанком. Теперь это коммерческое учреждение не только финансирует развитие малых предприятий, современных технологий, строительство кирпичных заводов, но и может осуществлять внешнеэкономические валютные операции.

Экстрасенс уходит из армии

(Соб. инф.). **Как уже сообщалось в печати, окружная газета «Во славу Родины» провела на своих страницах решительный эксперимент по поднятию морально-политического духа личного состава округа. А заодно и своего тиража.**

Один из последних майских номеров газеты был «заряжен» по просьбе редакции мощной биоэнергией офицера В. И. Сибилева, экстрасенса I международной категории. Обработку прошла вся бумага тиража и впридачу типографская краска. Эксперимент, говорят, имел полный успех... Теперь редакция планирует зарядить с помощью Сибилева еще два тиража. Жаль только, что Валерий Иванович не сможет продолжить сотрудничество с газетой, так как он уже положил на стол своего воинского начальства рапорт об увольнении из армии. Помышляет впредь заниматься только одним делом — демонстрировать на публике свои чудотворные способности, и, скорее всего, не за здорово живешь. Видно, непросто служить экстрасенсу в армии.

Голодовка, митинг...

РИГА (Инфоновости). В самом центре города на Домской площади продолжается голодовка латвийских участников ликвидации последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС. Они требуют от Верховного Совета Латвии ратификации Закона СССР «О социальной защите граждан, пострадавших вследствие чернобыльской катастрофы».

МАХАЧКАЛА. Вот уже который день продолжается здесь несанкционированный митинг мусульман, собравшихся в город из многих районов Дагестана. Требования, которые они скандируют в окна здания Совета Министров, — снизить до разумных пределов стоимость поездки к святым местам в Саудовскую Аравию.

Толькі без крыві!

МІНСК (А. Анціпенка). **69 дэлегатаў з розных гарадоў рэспублікі прадстаўлялі ўсе хрысціянскія канфесіі на адбыўшайся днямі канферэнцыі Беларускай Хрысціянска-Дэмакратычнай Злучнасці.**

На думку выступаўшых на ёй, негвалтоўнае ўдасканаленне розных бакоў грамадскага жыцця павінна стаць той падвалінай дзейнасці Злучнасці, якая не толькі згарантуе захаванне правоў кожнай асобы, але і паспрыяе ліквідацыі небяспечнай для далейшага развіцця грамадства канфрантацыі паміж рознымі сацыяльна-палітычнымі сіламі.

Страсти по президенту

ЮЖНО-САХАЛИНСК (Инфоновости). **В городах и селах Сахалинской области не наблюдается особой активности групп поддержки кандидатов на пост президента РСФСР... Исключение составляет только «команда» Николая Рыжкова.**

Это объясняется тем, что обком, горкомы и райкомы КП РСФСР настойчиво и упорно проводят в жизнь решение пленума ЦК Компартии России о поддержке кандидатуры Рыжкова на предстоящих выборах. Во всех районах области прошли собрания партийно-хозяйственного актива, по городам и районам разъехались работники аппарата обкома КП РСФСР. Активно помогают парторганизациям советы ветеранов войны и труда. Большая работа в пользу Н. Рыжкова идет в воинских частях.

Областная печать предоставляет свои страницы для выступлений «за» и «против» любого кандидата. Но если в газете «Советский Сахалин», одним из учредителей которой является обком КП РСФСР, публикуются в основном материалы «за» Н. Рыжкова, то в газете Советов «Свободный Сахалин» идут публикации преимущественно в поддержку Б. Ельцина. Остальные претенденты на президентский пост остаются как бы в тени. Правда, судя по всему, работники органов внутренних дел проигнорировали призыв МВД РСФСР поддерживать Б. Ельцина и собираются 12 июня отдать свои голоса В. Бакатину.

Краснодар нам поможет

— рассчитали комсомольские лидеры Березинского района и не ошиблись.

Решив впредь «радеть» только о членах ВЛКСМ, райком добился необычного для наших дней роста рядов районной организации. Накануне открытия летнего комсомольского лагеря труда и отдыха в Краснодарском крае заявления о вступлении в ВЛКСМ подали более 50 человек.

Как Владимира Адольфовича уличили в неискренности

ВИТЕБСК (Соб. инф.). **Всего через полгода после отчетно-выборной конференции коммунистов ПО «Витязь», прошедшей вполне успешно для избранного на новый срок секретаря парткома Владимира Макарова, он подал заявление об освобождении от занимаемой должности.**

Процедура сложения полномочий на партсобрании была аранжирована обвинениями в слабой работе и даже предложением исключить вожака из КПСС.

Владимира Адольфовича уличили в неискренности. Объясняя причины отставки, он сослался на личные расхождения с политикой Политбюро и Генсека ЦК КПСС. Но присутствующим было понятно, что Макаров продолжал бы руководить одним из крупнейших комитетов области, если бы не скандальная история с покупкой двух автомобилей подряд. И коль заведующему отделом облисполкома Валентину Пстыге аналогичная торговая акция стоила кресла, то почему к партийному лидеру следовало проявлять снисходительность?

Учитывая недавний горкомовский выговор, Макарова в партии все же оставили. Тем более что заводская коммунистическая организация за последнее время поредела почти наполовину, а многие бывшие ее члены поддерживают идею вывода парткома за ворота предприятия.

На альтернативной основе секретарем парткома избрали 45-летнюю Галину Францеву, до этого работавшую заведующей сектором партучета. Ушедший в отставку Макаров работает в том же объединении заместителем начальника производства КБ «Дисплей». Там, по-видимому, спокойнее.

Рисунок Олега ПОПОВА.

И здесь — очередь

МОСКВА (В. Сотников). **Структура Союза писателей СССР останется неизменной, по крайней мере, до октября нынешнего года. Это стало ясно после очередного заседания оргкомитета по подготовке 9-го съезда писателей СССР.**

Члены оргкомитета проголосовали за перенесение съезда на осень. Основная причина — отсутствие помещения. Большой Кремлевский дворец, где традиционно проводились писательские съезды, «расписан» на долгое время вперед. Какие-либо другие залы Москвы не подходят, одни из-за малой вместительности, другие — из-за плохой технической оснащенности. А хозяева Кремля обещают приютить писателей на несколько дней только в октябре.

За оставшиеся месяцы комиссия оргкомитета по выработке проекта нового устава Союза писателей будет работать над его усовершенствованием с учетом взглядов и принципов, заложенных в уставах республиканских писательских организаций. Вот только не изменится ли наша быстротекущая жизнь к октябрю настолько, что «обгонит» положения нового устава СП СССР? Придется, по пословице, считать по осени не только цыплят, но и голоса делегатов — за сохранение Союза писателей СССР. Есть другие мнения? Услышим их в октябре.

Помогите, кто может

Ко всем чернобыльским фондам

Обращаются к вам учащиеся Воловельской средней школы Дрогичинского района. Мы живем в зоне периодического контроля. Райком комсомола предложил нам 30 путевок в Ильичевск со 2 по 26 июля. Но стоят они очень дорого — по 500 рублей каждая. Где же нам взять такие деньги? Просим чернобыльские фонды оказать нам финансовую помощь.

С уважением и большой надеждой от имени учащихся — организатор внеклассной работы

ТАРАСЮК Людмила Богдановна.

Наш адрес: 225832, Брестская обл., Дрогичинский район, Воловельская СШ, т. 58-2-30.

Дежурила Ирина ДЕРГАЧ.

«ГОРЯЧИЙ ТЕЛЕФОН» РАБОТАЕТ ЕЖЕДНЕВНО С 9 ДО 11 ЧАСОВ. ТЕЛ. 32-24-02.

...И В ЖИЗНИ МОЕЙ—НАДЕЖНЫЙ ПРИЧАЛ

Консультации по психологии, экономике, педагогике, а также оздоровлению и лечению детей смогли получить родители-воспитатели во время первой республиканской встречи-семинара детских домов семейного типа. Сегодня в Белоруссии уже создано одиннадцать таких домов.

Веселый, сказочный праздник длился несколько дней. Звонкий, радостный детский смех, счастливые улыбки родителей и добрый урок общения—главные итоги встречи. Организовали ее Белорусское отделение Советского детского фонда имени Ленина, Министерство народного образования, БелНИИ образования и институт культуры.

НА СНИМКАХ: семье Сагайдаровых из Жодино, взявшей на воспитание десятерых детей, Детский фонд подарил микроавтобус; «Моя мамочка». Елена Васильевна Пытляк из Ивацевичского района Брестской области, имея четверых своих детей, взяла на воспитание еще пятерых. Много сил и времени было отдано выхаживанию самого слабенького—Ванечки (на снимке). А теперь его счастливая улыбка и привязанность—самый дорогой подарок.

Фото Юрия ПАВЛОВА. (БЕЛТА).

Адраджэнне

Вярнуць народу яго душу і памяць

Гутарка з сакратаром Рэспубліканскай рады Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны пісьменнікам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР Барысам Сачанкам перад II з'ездам ТБМ, які мае адбыцца ў Мінску 14—15 чэрвеня г. г.

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны

Прайшло два гады, як адбыўся ўстаноўчы з'езд ТБМ. Ужо можна падвесці пэўныя вынікі. Што зроблена, якія праблемы ўзніклі на шляху, якія новыя задачы неабходна вырашаць?

— Таварыства знаходзіцца ў стадыі станаўлення. Некалькі месяцаў пайшло на тое, каб яго зарэгістраваць, яшчэ некалькі — каб атрымаць памяшканне, тэлефон... Галоўная наша задача — узнавіць нармальныя, свабодныя ўмовы для развіцця нацыянальнай культуры, вярнуць беларускую мову ў паўсядзённы ўжытак, а народу — яго душу і памяць. Было б наіўна думаць, што тая сітуацыя з роднай мовай, якая склалася ў Беларусі, з утварэннем яшчэ аднаго добраахвотнага грамадскага таварыства — а менавіта такім з'яўляецца ТБМ — зменіцца за два гады ў лепшы бок. Супраць жа нашай мовы, каб яе не ведалі, каб яе забылі, працавалі дзесяцігоддзямі магутнейшыя дзяржаўныя структуры — спярша царскія, потым — сталінскія і абшарніцка-польскія. Гэтак званае двухмоўе хрушчоўска-брэжнеўскага тыпу прывяло да панавання ў сферы навукі, культуры і грамадска-палітычных адносін у рэспубліцы фактычна адной мовы — рускай. Тым не менш знайшліся людзі, якія ўсведамляюць, што такое для народа свая мова; яны і сталі энтузіястамі яе пашырэння і адраджэння. Ужо на самым пачатку мы прынялі самы актыўны і непасрэдны ўдзел у распрацоўцы і абмеркаванні праектаў «Закона аб мовах у Беларускай ССР» і Дзяржаўнай праграмы па яго ажыццяўленню, вылучылі і правялі на выбарах у Вярхоўны Савет БССР, у абласныя, гарадскія, раённыя і мясцовыя Саветы сваіх народных дэпутатаў. Выпускаем газету «Наша слова», арганізавалі на грамадскіх пачатках дзесяткі курсаў па вывучэнню роднай мовы, напісалі методыкі яе выкладання, прыступілі да выдання слоўнікаў і самых розных падручнікаў, дапаможнікаў. Наладзілі некалькі канферэнцый па самых актуальных пытаннях развіцця і бытавання беларускай мовы. Але гэта маленечкая частачка таго, што хацелася б, што трэба было б зрабіць. Беларуская ж мова толькі аб'яўлена дзяржаўнай, на самай жа справе такой яна ў нашай рэспубліцы пакуль не з'яўляецца. Яе па-ранейшаму ўсё яшчэ, за рэдкім хіба выключэннем, у сваёй працы і паўсядзённым побыце ігнаруюць як кіраўнікі рэспублікі, так і кіраўнікі абласцей, раёнаў і нават некаторых сельскіх Саветаў. Больш таго, сям-там пачалося адкрытае ці прытоенае супраціўленне, сабатаж — словам, робіцца ўсё магчымае, каб беларуская мова так і не стала дзяржаўнай. І як ні прыкра пра гэта гаварыць, далёка не лепшы прыклад падае тут сам Вярхоўны Савет рэспублікі. Яго Старшыня так і не навучыўся размаўляць на мове таго народа, інтарэсы якога па абавязку службы павінен абараняць. Наогул, моўная культура многіх народных дэпутатаў БССР такая нізкая, што іншы раз хочацца заткнуць вушы і не чуць таго гвалту, таго здзеку, які чыніцца з мовы, асабліва калі дэпутаты імкнуцца выступаць па-руску. Друкаваны орган Вярхоўнага Савета «Народная газета» таксама выдаецца на дзвюх мовах, як, дарэчы, вядуцца і пасяджэнні сесій Вярхоўнага Савета. Калі гэта лічыць часовай з'явай, пера-

(Працяг на 2-й стар.).

Памфлет

Я б в диктаторы пошел...

ПОКА юноши обдумывают житье, спешу застолбить вакантное место: я бы, граждане, в диктаторы пошел...

Но пусть меня сначала научат. А то наслушаешься нынешних парламентских и партийных разговоров о необходимости «сильной власти», срочном президентстве и чрезвычайном положении — и одолевают тяжелые сомнения. Впечатление такое, будто многие всерьез думают, что если запретить митинги и забастовки, усилить наряды, то рожь заколосится раньше срока, республика наестся до отвала и народ снова станет спокойно спать, праздновать и ликовать в преддверии еще более развитого социализма.

И потому многие хлопцы спешат. И договариваются до мысли посадить кого-нибудь на белорусское царство прямо на текущей сессии. Дело, стало быть, им представляется до боли простым: мол, народец на Белой Руси пока послушный, несмотря на апрельские грехи, сел — и кируй в заданном большинством направлении.

Смелые мысли. Но очень рисковые да опасные. И все потому, что пример явно берется из не совсем славного далека. Ведь раньше-то как было? Сплошная лафа диктатору! Попал меткими артвыстрелами в неприятельские форты — и вся женская Франция носит на руках, добился с трудом ефрейторского чина— и смело двигай группы армий на Восток; едва осилил три класса церковной семинарии — и железной рукой веди вверенный народец к счастью...

Словом, главной задачей было не переучиться. Но сейчас, ребята, так дальше не пойдет. Особенно у нас. Отбросим Европу — она нам в диктаторских делах давно не ровня: наши были по силе взгляда и кулака явно покрепче ихних. Да вот беда — никто на себя не надеялся. Один напирал на всемирно-историческое учение, энтузиазм масс и ударные пятилетки; другой — на кукурузу, коксагыз и торфяные горшочки; третий — на богатство страны, которое разворовать невозможно, как днем и ночью ни старайся.

Нет чтоб сказать прямо и открыто: выберете, мол, меня и будете слушать — икру ложками станем есть почти все поголовно уже в следующей пятилетке. Не сделаю — гадом буду, жизни себя на лобном месте прилюдно лишу и все такое прочее.

Так нет же — наобещают коммунизм и бесплатный проезд в общественном транспорте, а как стукнет срок — извините, хлопцы: Америка подгадила, догнаться не дала, наше сало съела. И все сходит под молчаливым взглядом советского народа как с гуся вода. Чист перед ним лидер-генсек-диктатор аки ангел небесный. И потому вручает сам себе по требованию общественности за такой честный труд и праведную жизнь очередной орден, а то и выше. Под бурные, продолжительные и нескончаемые, с выкриками «Слава!..»

В общем — мужественная страна, суровые нравы. А нынче ж пошло-поехало и того похлеще. Загнал народ в безмылье, безтрусье, безносковье, отдохнул малость на пенсионе — смело двигай в президенты; вылез на всесоюзную трибуну и сур-р-ровым генеральским голосом сморозил черт-те что — и дуй в претенденты.

И весь этот соседский опыт для нас очень даже поучителен. Не успели наши депутаты развернуть дебаты по вышеназванному трепетному вопросу, как из провинции в столицу уже двинули отчаянные ребята с горящими взорами — самовыдвиженцы и «независимые».

Все требуют «корону» и обещают райскую жизнь. Зашел, например, недавно к нам в редакцию некто В. Яковлев из славного города Гродно и смело предложил свой вариант превращения нашей Республики Голубых Озер и Зеленых Талонов в Страну Отоваренных Фондов.

Серьезный мужик. Но, боюсь, ему удачи пока не видать. Есть у нас мужики посолиднее. И они уже умело положили в свои ранцы президентские жезлы. По моим тайным наблюдениям, сделала это едва ли не половина нашего парламентского корпуса: у многих вдруг резко выступила многозначительность во взгляде, суровость в бровях, отеческая забота в словах.

Дела, словом, разворачиваются не на шутку. Но не наломать бы нам дров при такой раскладке. Диктаторское дело тонкое, а у наших претендентов такого подхода нет. Да и откуда ж ему взяться, если у нас приезд иного районного начальника в колхоз по-прежнему сопровождается почти императорскими почестями и народными гуляниями вплоть до танцев живота. А если ж который гаркнет во всю молодецкую мощь, исследуя причины «минуса» в надоях, то у коров молоко исчезает вообще, а у доярок уши вянут мгновенно.

Ну, а положи под такого еще, слава Богу, целую и неопытную в суверенно-президентских делах Белую Русь? Что ж он с беднягой сделает? И что ж на все это скажет наша Родина-мать?..

Не-ет, хлопцы, так дело не пойдет. И как ни крути, а кроме меня в президентско-диктаторских делах разобраться пока некому. Но надо малость подучиться, того-сего поднахвататься у знающих людей. Например, конструктивной заморской пословице: «Слов на ветер не бросай, что наметил — выполняй».

Я что-то очень симпатизирую в этом вопросе стране под нежным названием Сингапур. Три десятка лет правил ею господин Ли Куан Ю. Хоть и строг, но справедлив. Взявши в руки свою страну в примерно таком же состоянии, как наш человек после новогодней ночи, вылечил он ее быстро. И кнутом работал, и пряником. Да и сейчас вожжи натягивает крепко. Но что-то не сердится на него за это сингапурский народ. Наоборот, охотно спину подставляет: «Бей, батюшка, да уму-разуму учи!» И учит. Вот и сына своего к диктаторскому делу приставляет. Качественно и самоотверженно, словом, работают. На совесть. И если что не так — на погоду и смежников не сваливают, сами дела делают. Вот и удивляется весь мир «сингапурскому чуду».

Да и в других странах у диктаторов-императоров - президентов руки больше к работе тянутся, чем чешутся по резиновому изделию в виде палки и «одеколону» с милым сердцу названием «Черемуха»...

Знаем мы эти черемухи. А вот в Японии не так. Сидит себе император и в ус не дует, как бы это попридушить побольше своего народа да напугать до тика в суставах. А ведь «голубая кровь», элита.

Наш же иной «выходец из народа» спит и видит, как бы вылезти из грязи в князи да задать соотечественникам жару. Да по порткам их, по порткам, мать их туды!.. Всех в струнку, в линию, в колонну! Шаг вправо — считается побег, слово влево — измена святому делу. Деструктивные силы, разом к стенке выходи! Остальные напра-ву! кру-у-гом! По раз и навсегда выбранному верному пути бего-о-ом марш!..

Боюсь, забежим так далеко... А потому и спешу податься в теплые края потолковать с некоторыми диктаторами - королями - императорами о жизни. Верховный же Совет родной суверенной страны-республики прошу зафиксировать данную статейку в качестве официальной заявки на длительную командировку. Окажете доверие — не подведу! Буду учиться диктаторскому делу настоящим образом: себе на заметку, всем на пользу.

Ну, а вам при отлучке наказ дам такой: ведите себя смирно, смуты не допускайте, казну берегите пуще глаза. Да и про строгие указы, ограничивающие волю общего «батьки», не забывайте. А то воздух в наших краях больно особый, и в головах поэтому у многих, даже местных руководителей-диктаторов, туман. Вот и заносит частенько не туда: то «огненная вода», то грудастые плутовки, то краплёная колода...

В остальном же дожидайтесь меня. Пока не выучим настоящего белорусского «атамана», надо править республикой общим колхозом. Вернусь — тогда и начнем президентствовать по-настоящему.

В общем, приеду — погутарим. А то самотугом, без диплома да при наших-то законах и нравах сейчас диктаторствовать не с руки — как бы снова не остаться на второй срок в этом же веке...

Павел СТАСЕВИЧ.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Адраджэнне

Вярнуць народу яго душу і памяць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ходных перыядах — ніяк нічога. А калі яно, такое двухмоўе, замацуецца, увойдзе ў практыку?

Выдаўцы спасылаюцца на рынак, а на самай справе гоняцца за чыстаганам, абыходзяць усякімі праўдамі і няпраўдамі Закон аб мовах, ігнаруючы яго. Дзіўна проста — на беларускія кнігі раптам не стала хапаць паперы, паліграфічных магутнасцей, затое ўсяго гэтага з лішкам хапае на розныя камерцыйныя выданні. Калі міністэрствы адукацыі і культуры распрацавалі праграмы пераходу на мову свайго народа і паступова, хоць і з пэўнымі цяжкасцямі, іх выконваюць, дык астатнія міністэрствы не спяшаюцца гэта рабіць. Органа ж, які б не толькі сачыў за выкананнем Закона аб мовах, але і дапамагаў бы ўсім, хто жадае авалодаць беларускай мовай, ды і іншымі, якія бытуюць у рэспубліцы, няма. А ён жа прадугледжваўся, калі складалася Дзяржаўная праграма па ажыццяўленню закона! Значыцца, справа пушчана на самацёк. Як трэба было знішчаць беларускае слова, дык гэта рабілася паслядоўна і мэтанакіравана на дзяржаўным узроўні. А як справа пайшла пра адраджэнне і месца ў грамадстве, дык гэтым займаюцца добраахвотнікі...

Пракуратура БССР, якая павінна сачыць за выкананнем гэтага, як і ўсіх іншых законаў, ды і сама іх выконваць, занята тым, каб прывесці «Закон аб мовах у Беларускай ССР» у адпаведнасць з саюзным, а гэта значыць, ліквідаваць некаторыя вельмі важныя яго палажэнні. Пракурор БССР Г. С. Тарнаўскі, замест таго, каб самому навучыцца гаварыць па-беларуску, на адным з пленумаў ЦК КПБ спрабаваў абвяргаць закон, маўляў, ён парушае правы чалавека. А жыць сярод народа гадамі, мець усё, што заслужыў і не заслужыў, і не ўмець размаўляць на яго мове... Ды нічога, будуць прадстаўнікі некарэннай нацыі вучыць беларусаў, што яны павінны рабіць са сваёй мовай, [illegible]нях законы, а якія не... Што гэта?..

— З'езд ТБМ мае адбыцца 14—15 чэрвеня ў Мінску. Які будзе яго парадак?

— На абмеркаванне з'езда выносіцца некалькі пытанняў. Галоўнае з іх — гэта роля грамадскіх [illegible] і іншых арганізацый [illegible] ў нацыянальнай [illegible] беларускай культуры. Блізка да гэтага пытання стаіць і наступнае — аналіз дзяржаўнай моўнай палітыкі ў Беларускай ССР, грамадскі кантроль за ходам ажыццяўлення Закона аб мовах у БССР. І трэцяе пытанне, на якім хацелася б засяродзіць увагу, — удакладненне правапісу беларускай літаратурнай мовы, бо ён у сталінскія часы быў скалечаны, гвалтоўна зменены некампетэнтнымі ў пытаннях мовы людзьмі, яго набліжалі да рускага, не ўлічваючы асаблівасцей і законаў нашай мовы. (Вось бы Пракуратуры БССР [illegible] незаконна [illegible] яго [illegible] адмяняць [illegible] крымінальныя [illegible] хто [illegible] Вярхоўным Саветам [illegible]) Адносна правапісу [illegible] вярнуцца [illegible] — каб [illegible] унесці [illegible].

— Некаторыя [illegible] ТБМ і БНФ...

— Тыя, хто гэта робіць, — глыбока памыляюцца, бо Таварыства беларускай мовы не ставіць перад сабой палітычных мэт. Яно аб'ядноўвае ўсіх, каму неабыякавы лёс роднай мовы, хто хоча вярнуць народу яго душу і памяць, культуру і гісторыю. Мова ж — не толькі [illegible] культуры, гэта тое, што яднае, цэментуе нацыю. Няма мовы — няма народа. Гэта добра разумелі [illegible], і першае, з чаго яны [illegible] на[illegible] [illegible] адна [illegible] народ, [illegible] ў Беларусі [illegible] розных [illegible] ўваходзіла ў склад розных дзяржаўных утварэнняў, а захавалася. І захавалася дзякуючы сваёй мове, культуры. Таму ў нашым таварыстве ёсць і члены ЦК КПБ, і члены Сойма БНФ, члены і кіраўнікі іншых партый і арганізацый, якія ўзніклі, працуюць у Беларусі і за яе межамі.

— Барыс Іванавіч, Вы ў сакратарыяце Рэспубліканскай рады ўзначальваеце такі важны накірунак дзейнасці, як сувязь з суайчыннікамі. Калі на Бацькаўшчыне створаны 71 рэгіянальная арганізацыя, а таксама 20 калектыўных сябрын, то колькі прыхільнікаў роднай мовы за межамі Беларусі стварылі свае суполкі ў рэспубліках Савецкага Саюза і за яго межамі?

— Лёс роднай мовы, як я казаў ужо, яднае ўсіх беларусаў, дзе б яны ні жылі. Таму нацыянальна свядомыя людзі ствараюць па ўсім свеце свае арганізацыі. Суполкі ТБМ ёсць у ЗША, Аўстраліі, Канадзе, Польшчы, Чэхаславакіі. Ёсць яны і ў Літве, Латвіі, Эстоніі, на Украіне, у Казахстане, РСФСР. Словам, усюды, дзе жывуць беларусы. Самыя вялікія і актыўныя — у Кліўлендзе (ЗША), на Беласточчыне (Польшча), у Маскве, Ленінградзе, Вільнюсе, Рызе... Вядома, гэтыя суполкі, як і ўсе іншыя, патрабуюць ад нас дапамогі. На жаль, аказаць яе мы не заўсёды можам. Арганізацыя нашая пакуль што бедная. Тыя, хто мог бы нас падтрымаць матэрыяльна, не вельмі спяшаюцца гэта рабіць. Мусіць, лічаць, што ёсць куды больш важныя ўчасткі. А мова... Пражывём і з той, якая ёсць. А яшчэ ж славуты папярэднік Ф. Багушэвіч казаў: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!» Словы гэтыя, іх глыбінны сэнс добра разумеюць тыя, хто па розных прычынах не жыве на сваёй Радзіме. Таму з іх боку мы маем поўнае ўзаемаразуменне і падтрымку. Дачакацца б таго і ад тых, хто нікуды са сваёй зямлі не едзе і не збіраецца ехаць, жыве і будзе жыць тут. Хацелася б нагадаць такім словы, з якімі звярталася калісьці да ўсіх беларусаў вялікая патрыётка Ларыса Геніюш:

Матчынай мовы, багатай
і слаўнай,
Што ў скарбах народа,
бы фонд залаты,
Не аддавайце бяздумна,
бясправўна,
Не прадавайце святога,
браты!

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.



Гаспадыня.

Фота Юрыя ІВАНОВА.

Нам стала вядома

Запрашае «Анкор»

Сёння, 11 чэрвеня, адбудзецца прэзентацыя сумеснага савецка - амерыкана - польскага прадпрыемства «Анкор». Яна пройдзе ў Мінску па адрасу: праспект Машэрава, 14. Будзе прапанаваны агляд выстаўкі, прэс-канферэнцыя. А заўтра — семінар, дзелавыя сустрэчы. На іх запрашаюцца ўсе жадаючыя. Там вы і даведаецеся, што ўмее і можа «Анкор».

А пакуль што нагадаем асноўныя кірункі яго дзейнасці. Гэта даследаванні ў галіне квантавай электронікі, лазернай фотахіміі, біятэхналогіі... Гэта і будаўніцтва аб'ектаў прамысловага і грамадзянскага прызначэння як у нашай краіне, так і за мяжой, і выпуск тавараў народнага спажывання—швейных вырабаў, мэблі, фурнітуры

«Анкор» — гэта сем вытворчых, навукова-вытворчых і камерцыйных аб'яднанняў, 38 філіялаў і фірм у розных рэгіёнах краіны.

Іван СЯРГЕЕЎ.

Канфлікт

ПАКІРАВАЛІ,

або Якую карысць прынесла вясковай школе залішняя апека?

Калі гавораць, што чалавек на рабоце днюе і начуе — дык гэта пра дырэктара Міхалёўскай школы. У літаральным сэнсе, бо ён у школе жыве. І, хаця ўжо даволі ладна абсталяваўся ў спартыўнай зале, усё ж, згадзіцеся, гэта не кватэра.

Дарэчы, летась, калі новы дырэктар з'явіўся ў калгасе імя XXII з'езда КПСС, кватэру яму далі. Добрае забеспячэнне спецыялістаў жыллём — гонар мясцовага старшыні. Менш чым праз год той жа старшыня А. Лабковіч дырэктара з кватэры выселіў.

— Ну, не выселіў,—не згаджаецца старшыня, — а папрасіў з'ехаць. Кватэра спатрэбілася прыезджым спецыялістам — клубным работнікам.

Дырэктар школы — таксама прыезджы малады спецыяліст —змагацца за вуглы не стаў і назаўтра раніцай здаў старшыні ключы, бо той прыспешваў. Клубныя работнікі, праўда, засяліліся не ў яго, а ў суседнюю кватэру. А дырэктарская плошча яшчэ амаль два месяцы пуставала, новыя гаспадары з'явіліся ў ёй зусім нядаўна.

Калі б гісторыя з кватэрай была адзіным абсурдам, з якім сутыкнуўся малады дырэктар, наўрад ці стаў бы ён пісаць у газету. Проста яна — апошняя кропля, тая, што цераз край...

Алег Жынгель для Бярэзінскага раёна быў спецыялістам каштоўным. Па-першае, выпускнік інстытута замежных моў, іх у глыбінцы нямнога. Па-другое, чалавек ён неардынарны, цікавы, энергічны. Па-трэцяе, пасля радыеактыўнага забруджвання колькасць ад'язджаючых адсюль спецыялістаў-педагогаў значна большая, чым прыязджаючых. Таму кіраўніцтва Бярэзінскага РАНА не доўга вагалася, даручаючы васьмігодку ў аддаленай вёсцы маладому педагогу: дырэктары не нараджаюцца, яны вырастаюць. Калі праз год бліжэй да райцэнтра, у вёсцы Міхалёва, педкалектыў «скінуў» дырэктара, выказаўшы яму недавер, Жынгель, палічылі, дарос да таго, каб заняць вакантную пасаду.

Трэба сказаць, што Алег Пятровіч мае ўласны погляд на многія праблемы педагогікі і выхавання. Напрыклад, ён не адступае ад прынцыпу ацэнкі ведаў толькі па ведах. Прынцыповая аб'ектыўнасць даводзіла да таго, што часам амаль палова вучняў мела па нямецкай мове двойкі. А Алег Пятровіч стаяў на сваім. Дарэчы, прадмет свой Жынгель выкладае арыгінальна — да навацый прымусіла жыццё. Калі дырэктар вёў замежную мову ва ўсіх класах, прыйшлося мець 18 гадзін нагрузкі ў тыдзень. А калі ж займацца дырэктарскімі справамі? Вось і прыходзілася выкручвацца, аб'ядноўваючы класы. «Выпаў» адзінаццаты, дзе нямецкай мовы толькі гадзіна ў тыдзень.

Са з'яўленнем новага кіраўніка, як водзіцца, адбываецца нямала перамен. У Міхалёўскай школе, напрыклад, набылі папулярнасць адкрытыя ўрокі з абмеркаваннем. На прышкольным участку вырасла вялізная цяпліца. Планаваў Жынгель упрыгожыць пустыры вакол школы квітнеючым садам...

Так мінуў год. Спецыялісты з РАНА, якія на працягу яго двойчы правяралі работу школы, асаблівай занепакоенасці не выказваюць: ёсць у раёне педкалектывы, дзе больш сталыя кіраўнікі горш спраўляюцца. І хаця не ўсе ідэі новага дырэктара раённы аддзел падзяляў, перашкод не чыніў ніякіх.

Тым часам міхалёўскі дырэктар станавіўся ўсё больш прыкметнай асобай у раёне. Стварыў, напрыклад, камітэт па абароне правоў настаўнікаў, які стаў далучацца да забастовачнага руху педагогаў у рэспубліцы. Праўда, зарэгістраваць арганізацыю Жынгель не паспеў: пачаліся цяжкія часы.

З чаго пачаліся? Магчыма, з абласнога злёту настаўнікаў, дзе Жынгель прапанаваў наменклатурна - партыйнаму дакладчыку падбіраць больш карэктныя выказванні ў адрас Старшыні Вярхоўнага Савета Расіі. Маўляў, усе ж мы культурныя людзі. Пэўна, той дакладчык моцна пакрыўдзіўся, бо пра некарэктныя паводзіны самога Жынгеля адразу ж паведамілі ў раённы камітэт партыі.

Ці кропля адліку непрыемнасцей — рэферэндум? У час яго падрыхтоўкі Жынгель агітаваў вяскоўцаў супраць уваходу Беларусі ў Саюз, чым унёс разлад у сугучнасць лектарскай групы.

А можа, цяжкія часы накаваны былі з нагоды выступлення на нарадзе дырэктараў школ раёна? Алег Пятровіч выказаўся даволі рэзка супраць узмацнення ідэалагічнага ўплыву на школьную моладзь, нават паабяцаў супраціўляцца гэтаму. Тады ж аб'явіў, што збіраецца выйсці з радоў КПСС.

Адным словам, дакладна невядома—з чаго, але пачалося... Міхалёўская школа не адчувала такой увагі з раёна нават у часы, калі тут бунтавалі педагогі, скідваючы былога дырэктара. Сакратар райкама КПБ па ідэалогіі К. Ермакоў, у мінулым таксама школьны дырэктар, наведваннем школы і прыёмам застаўся незадаволеным. Сакратар партыйнай арганізацыі калгаса А. Цяпера, які спрабаваў гутарыць з членамі калектыву разам і паасобку, таксама не меў поспеху. Школа і дырэктар упарта адмаўляліся ад іх дапамогі, не жадалі, каб партыйныя кіраўнікі ўмешваліся ў педагагічныя справы, спасылаючыся на тое, што ёсць у выкладчыкаў і дырэктара сваё начальства — раённы аддзел народнай адукацыі.

Такім чынам, пакуль парламентарыі не вырашылі пытанне аб дэпалітызацыі навучальных устаноў, у друку ідуць спрэчкі, у Міхалёўскай школе, відаць, яна пачалася ўжо...

Партбюро калгаса ў адказ на свавольства стварыла камісію, у якую, акрамя самога сакратара — загадчыка фермы і камуністкі-даяркі, увайшоў той самы славуты «скінуты» дырэктар В. У. Баразнёнак. Гэтакай кампаніяй і ўзяліся правяраць работу школы і яе дырэктара.

Чаго не хапіла прадстаўнічай камісіі, цяжка сказаць, але справу сваю яна да канца не давяла. Старшыня камісіі Баразнёнак так нічога дакладна не змог далажыць адкрытаму партыйнаму сходу.

Пра сход варта расказаць асобна, тым больш што ход яго запісаны на магнітафонную стужку. На парадку дня — справаздача камуніста Жынгеля за даручаны ўчастак работы. Напярэдадні Жынгелю і беспартыйнаму завучу камісія склала цэлы спіс пытанняў, на якія хацеў мець адказ партыйны сход. Але Жынгель загнаў у тупік таварышаў па партыі простым пытаннем: «Які ўчастак работы даверыла дырэктару школы партыйная арганізацыя?»

І сапраўды — які? Доўга спрачаліся, а Жынгеля так і не давялося заслухаць. Ушчувалі дырэктара, папярэджвалі, каб «не дакацілася школа да таго, што было ў мінулым годзе», маючы на ўвазе скандал з былым дырэктарам. Пагаманілі — трэба і вынікі падводзіць. Сталы калгаснік прапанаваў радыкальны сродак, «каб школа не дакацілася»: дырэктара з партыі выключыць і паставіць пытанне аб звальненні. Пэўна, сямідзесяцігадовы пенсіянер добра разбіраецца ў школьных справах. Вядома — ён жа родны бацька былога дырэктара. У школе, акрамя сына Баразнёнка, працуюць яшчэ і яго нявестка, і ўнук. Нават унучка на час летніх канікулаў афармлялася пры папярэднім кіраўніцтве лабаранткай. Ды і сам старшыня ў той час лічыўся пры школе пастаянным качагарам.

Прапановы — выключыць ці аб'явіць дырэктару вымову — паставілі на галасаванне. Ужо па трэцяму разу галасы пералічваюць, а ніводная з прапаноў не набірае патрэбнай колькасці. Сакратар райкама нервуецца: трэба ж якое-небудзь рашэнне прыняць.

— Калі чалавек не згодны з адным пакараннем, дык ён абавязаны прагаласаваць за другое.

Вось так — не пакінуў сакратар галасуючым трэцяга рашэння. Пэўна, і схіліў бы сход да выключэння Жынгеля з партыі, каб нехта з прысутных не пацікавіўся: дык за што?

І зноў — няёмкасць. Тэзіс пра «даручаны ўчастак работы» ўжо адпаў сам сабою. Нарадзіўся новы — за ігнараванне патрабаванняў статута. Скрупулёзны Жынгель зноў за сваё: якіх канкрэтна? Сталі шукаць іншую фармуліроўку: за невыкананне рашэнняў вышэйстаячых органаў...

Валтузіліся, але так і не вырашылі, за што ж пакараць дырэктара. Сход рашэння не прыняў і скончыўся палымяным зваротам сакратара райкама да дырэктара, яго калег і ўсіх прысутных: «Задумайцеся!»

Вось цяпер яны і задумваюцца.

Жынгель — пра тое, ці не падацца куды-небудзь у іншыя мясціны.

Яго калегі — маладыя педагогі — пра тое, што пасаду Алега Пятровіча хутчэй за ўсё зойме Баразнёнак і паверне школу на былы лад.

Старшыня калгаса — пра тое, што дырэктар з хітрасці, відаць, пасяліўся ў школе, каб было сорамна старшыні перад людзьмі.

Парторг калгаса — як бы больш не трапляць у такое непрывабнае становішча, перад вёскай не канфузіцца.

А начальнік РАНА — дзе ж узяць настаўнікаў, калі з заяўкі на 80 спецыялістаў раён атрымаў пакуль што ўсяго 5 выпускнікоў ВНУ.

І ўсе разам — якую карысць прынесла падобнае партыйнае кіраўніцтва вясковай школе?

ІРЫНА ЧАБАНОВІЧ,
аглядальнік па пытаннях адукацыі.

Бярэзінскі раён.

Пазіцыя

Па слядах адной заявы

З вялікім здзіўленнем прачыталі мы, члены рады Саюза пісьменнікаў Беларусі, на старонках «Народнай газеты» за 21 мая 1991 года тэкст заявы, адрасаванай Вярхоўнаму Савету БССР і Мінскаму гарадскому стачачнаму камітэту, пад якой стаяў подпіс: «Рада Саюза пісьменнікаў Беларусі». Яна сцвярджала, што нібыта ўсе мы безагаворачна падтрымліваем зварот «Да народных дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР!», прыняты на канферэнцыі стачачных камітэтаў рэспублікі 11 мая 1991 года. Аднак гэта зусім не так! Ніхто з нас з тэкстам заявы не быў папярэдне азнаёмлены, ніхто яе не падпісваў.

Справа ў тым, што на пасяджэнні рады Саюза пісьменнікаў Беларусі 14 мая было ўзнята пытанне аб падтрымцы рабочага руху ў рэспубліцы пісьменнікамі. Была спецыяльна абрана камісія па выпрацоўцы тэксту заявы. Было дамоўлена, што пасля яго напісання кожны член рады будзе непасрэдна азнаёмлены з заявай і — вядома, пры згодзе — падпіша яе. Але таварышы, якім даручылі скласці тэкст заявы, не палічыліся з нашымі правамі: самі склалі, самі ўхвалілі, самі і падпісалі заяву.

Мы катэгарычна пратэстуем супраць парушэння нашых правоў, агавораных статутам Саюза пісьменнікаў Беларусі, і заяўляем, што ніякіх адносін да тэксту заявы не маем. Што ж тычыцца канкрэтных патрабаванняў стачкамаў, то, безумоўна, ёсць сярод іх і справядлівыя, слушныя, да якіх нельга не прыслухацца і не падтрымаць, ёсць і такія, якія па свайму зместу не адпавядаюць існуючым прававым нормам і якія мы не можам прыняць, бо яны да таго ж супярэчаць нашым асабістым перакананням. У прыватнасці, мы лічым антыканстытуцыйным патрабаванне нацыяналізаваць маёмасць КПБ—КПСС. І разам з тым рашуча падтрымліваем рух рабочых за паляпшэнне свайго сацыяльна-эканамічнага становішча.

Члены рады Саюза пісьменнікаў Беларусі:
Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Васіль ХОМЧАНКА, Іван ШАМЯКІН, Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Юрась СВІРКА, Барыс САЧАНКА, Яраслаў ПАРХУТА, Генадзь ДЗМІТРЫЕЎ.

Подсказка журналиста

ДАЙТЕ ВОЛЮ ЧЕРВЯЧНОЙ МАФИИ!

ОХ, ЕСЛИ уж не везет Стране Советов — так решительно во всем. Даже в делах, так сказать, подземных. Сообщу, например, вам, сограждане, что наш красный дождевой червяк почти в десять раз ленивее своего американского коллеги. Слабачок, так сказать...

Хотя, по правде, темпераментный ковбойский характер у американца воспитывался в солнечной Калифорнии еще с 30-х годов. И пока мы напирали на сплошную коллективизацию, широкую мелиорацию и повальную химизацию, красный калифорнийский червячок широким фронтом погнал на щедрые заокеанские прилавки безнитратную, экологически чистую продукцию.

Понятно, что без рук да ног непосредственно в привозе-отвозе он не участвовал. Да и некогда было. Ведь червячок занимался главным — круглые сутки ударно производил и производит по сей день **биогумус**. Слово выделяю —эта продукция со знаком высшего качества. Во всяком случае, практичные американцы, по последним данным, имеют около 700 участков, где уход и ласку гибриду красного калифорнийского червя обеспечивают в широких промышленных масштабах. Сотнями исчисляются такие участки в Японии, Италии, ФРГ, Франции, Венгрии, Польше и т. д.

Чем же берет во всем мире сердца, души и деньги калифорнийский «ковбой»? Неужели одной только наглостью?

Отнюдь. И если коротко, то истинным американским характером: трудолюбив, темпераментен, неприхотлив. Не буду для этого подробно вдаваться в его уже солидную «биографию» и сразу обрисую нынешние деловые качества.

Хотя — нет, маленькое предисловие для полноты представления все-таки необходимо. Наши люди в большинстве своем, надеюсь, знают, что почва — это живой организм, в котором микро- и макрофауна и являются создателями того самого гумуса, кормящего все человечество. А вот о количестве «создателей» многие, думаю, только догадываются. Так вот, по научным данным, главная роль в создании гумуса принадлежит дождевым червям — их вес составляет от 50 до 70 процентов всей биомассы нормальной почвы, а общее количество на гектаре — от 500 тысяч до 20 миллионов.

Серьезная армия. Но она, слава Богу, не воюет, а денно и нощно работает: установлено, что за лето популяция из 100 червей прокладывает в почве на одном квадратном метре... километр ходов! А если принять количество червей на кв. метре за 50, то за сутки через их кишечник на одном гектаре площади проходит четверть тонны почвы. За сезон в целом эта «гора» будет весить 50 тонн!..

Мал да удал — говорят в народе в таких случаях. Тягаться с червячком в полезной деятельности для человека никакая современная техника не в силах. Жаль, что мы только сейчас начинаем понимать эту еще дедовскую науку. А она была проста: взял лопату, копнул, глянул: копошатся один на одном красные червяки, «як парсюки», — здоровая почва, щедрой будет нива. А если под лопатой ленивые, бледные замухрышки — беда, лечить надо землю, червячка всеми силами завлекать.

Просто и ясно. Но мы над дедами посмеялись и налегли на селитру, сульфат аммония и дуст. И за широким тракторным плугом грачи и прочие пернатые постепенно летать перестали — что там найдешь в этих «перехимиченных» стерильных песках! Рыбаки — и те руки опустили, перешли на хлеб и прочие несерьезные магазинные наживки.

Ушел, уходит, словом, из наших почв дождевой червяк, создававший ранее черноземы. Не любо ему у нас.

Хотя, по правде, те же американцы до такой жизни дошли гораздо раньше нас. Но — вовремя одумались, по-деловому прикинув, что гораздо выгоднее и дешевле не делать экологических глупостей, чем потом героически с ними бороться. И потому начали серьезно **строить** не только небоскребы, но и кое-что посолиднее — почву, кормящую Соединенные Штаты.

ИМЕННО из этого понимания и начал свое шествие по планете гибрид красного калифорнийского червя, от нашего простого дождевого отличающегося только качествами, о которых я говорил выше. Причем ему в этой и других странах помогают и правительства, выделяя фирмам, занимающимся разведением, а точнее — производством дождевых червей, безвозмездные дотации и выгодные кредиты. Живи, червячок, размножайся! Куй доллары государству и здоровье — нации!..

И он кует. Во-первых, ударно производимый им биогумус дал возможность выращивать продукцию практически без нитратов и тяжелых металлов. Во-вторых, после внесения нужного количества биогумуса, скажем, под тепличные овощи никакие другие удобрения здесь целый год больше не нужны. Даже наш самый лучший навоз «калифорнийцу» не соперник — американец раза в четыре «богаче». В-третьих, дренажная система, созданная ходами червей (причем под любым углом к горизонту!), дает почве возможность легко «дышать» и свободно «пить». В-четвертых, и белковая продуктивность червей выше всяких похвал. Если, например, отличное клеверное поле с одного гектара дает одну тонну белка, то «калифорнийцы» с такой же площади дают 40 тонн белковой массы с 67-процентным содержанием белка. В-пятых, — и это одна из главных отличительных черт калифорнийского гибрида — он приспособлен к промышленной среде. Это значит, что «ковбой» может с успехом использоваться (и уже используется) человеком в борьбе с различными отходами, которыми буквально окружены города. С единственным, конечно, условием — эта продукция «переработки» должна употребляться не в пищевых, а в сугубо промышленных целях.

Есть и другие достоинства у «калифорнийца», но обо всем за дефицитом газетной площади не расскажешь. Отмечу лишь, что многочисленные проверки биогумуса, выданного на-гора калифорнийским гибридом, показали: он дает прибавку урожая практически всех сельхозкультур, но особо — овощных; сводит на нет многие болезни; обеспечивает ускоренное прорастание семян и лучшую приживаемость высаженной рассады; приближает сроки созревания урожая; улучшает вкус, запах и цвет овощей и фруктов и т. д.

Незаменимый, что там говорить, помощник. Завидный работник. Одними из первых в нашей стране на него «вышли» на соседней нам Украине, в Ивано-Франковске. И дело в короткий срок поставили на широкую ногу. Создали даже ассоциацию «Биоконверсия». Сейчас там, говоря советским языком, школа передового опыта по этому делу.

Ну а у нас в Белоруссии «крестным отцом» всей этой работящей калифорнийской червячной «мафии» стал председатель «Белсельхозхимии» Виктор Васильевич Шувалов. Подцепив у соседей идею, он ею распорядился умело, т. е. сразу начал искать делового, творчески мыслящего человека, способного по-серьезному сладить с «калифорнийцем», не боясь ироничных насмешек. И такой человек нашелся в лице директора гомельского овощеводческого совхоза «Брилево» Аркадия Тарасовича Кобрусева.

Сказано — сделано. Брилевцы по-быстрому съездили к ивано-франковцам, что надо — посмотрели, что требовалось — прикупили, и дело завертелось. Да и то сказать — ни к чему было гомельчанам тянуть волынку. Радионуклиды да нитраты... — многовато на человека в этих краях. И тут, поняли уже давно, никаким контролем дело не выправить — шуму много, но стрельба идет по воробьям.

А вот на биогумус ставку сделали. И, тьфу-тьфу, пока не жалеют. Во всяком случае, сейчас в «Брилево» «калифорнийцев» почти на все теплицы хватит, а когда вы будете читать этот материал, В. Шувалов и А. Кобрусев уже вернутся из Киева, куда приглашались на трехдневный всесоюзный семинар по многообещающему червячку.

ДЕЛА, значит, идут. «Ковбой» в «Брилево» не спит, старается изо всех сил. Условия ему обеспечены. И есть надежда, что вскоре наше население начнет брезгливо воротить нос от овощей, на которых не будет указано, что они выращены исключительно на биогумусе.

Но это — в будущем. И чтобы оно стало ближе уже скоро, одного «Брилева» нам явно мало. И этот материал я пишу не ради экзотики, а с единственной целью — привлечь внимание руководителей, специалистов овощных (и не только!) хозяйств, арендаторов, кооператоров, фермеров:

— Наклевывается выгодное всем вам и нам дело! Биогумус у вас с руками оторвут все — от соседнего колхоза-совхоза до дачника и цветовода-любителя. Поддержим «калифорнийца» на белорусской земле!..

Тем более, что ничего особого он не требует. Я вместе с В. Шуваловым внимательно изучал «Методические указания» по промышленному разведению калифорнийского гибрида и тоже понял: ничего сверхсложного там нет. Главное — обеспечить четкое снабжение сырьем, т. е. навозом, опилками, прочими органическими отходами. Чего-чего, а этого добра у нас всюду хватает. В остальном — наука нехитрая. Было бы желание.

Так что — дерзайте! А кооператив «Плодородие» при ивано-франковском объединении «Сельхозхимия» (ул. Гаркуши, 2) вам поможет: здесь уже ведут по заявкам хозяйств подготовку биотехников-червеводов. Ну а поначалу глянуть глазом на «калифорнийца» можно и в нашем «Брилево». И — решать.

Ведь червячок этот (и землячок наш тоже!), видно по всему, входит в моду не ради насыщения наших желудков. Не такие они простейшие, чтобы не сказать нам, сложнейшим: дальнейшая химизация сельского хозяйства — это способ получения урожая в долг. И эти долги, если не остановиться, будет платить (если уже не платит) будущее поколение.

Опасный путь. И простой червяк показывает нам: выход — в использовании огромнейших возможностей **живой** природы, а не в борьбе с ней. Дружбу с братьями нашими меньшими на земле и под землей нужно всемерно укреплять. Они, думается, помогут нам найти выходы из всех наших экологических и продуктовых бед, и эти выходы будут гораздо здоровее и надежнее атомных шалостей да химического оружия в виде нитратов.

Во всяком случае, червячок, «сделанный в США», это доказывает убедительно.

Павел МОТОЛЬСКИЙ.

Просім слова!

Мы дайшлі да апошняе мяжы цярпення

Адкрыты ліст у ЦК КПБ

З філалагічнага факультэта старэйшага на Беларусі універсітэта, які ў бягучым годзе адзначае сваё сямідзесяцігоддзе, выйшлі ў жыццё многія пакаленні добра вядомых у краіне людзей, якія самааддана працуюць дзеля справы нацыянальнай адукацыі і культуры. Але заняпад паціху падабраўся і да нашага факультэта. На філфаку катастрафічна не хапае навучальных плошчаў: даўно парушаны ўсе санітарныя нормы, адсутнічаюць элементарныя ўмовы для працы.

Тым часам літаральна праз вакно можна дзівіцца, як пашыраюцца і ўзбуйняюцца бастыёны ЦК КПБ. Насупраць — гасцініца таго ж ЦК; не трэба і казаць, што работнікам партапарату не сорамна за яе інтэр'еры перад любым заходнім бізнесменам. Побач размешчаны немалы масіў лячэбных карпусоў былога Чацвёртага ўпраўлення, дзе не так даўно пільна сачылі за здароўем слуг народных. Крышачку прайдзіце ў бок стадыёна — і ўбачыце яшчэ адзін партыйны дом — гаркам. Недалёка — будынак абкама КПБ.

Паміж усёй гэтай камфортнасцю, быццам іншародныя целы, туляцца галоўная бібліятэка рэспублікі і старэйшы факультэт... Складваецца ўражанне, што нашай партыйнай эліце, якая па-ранейшаму валодае ўсім лепшым, няма аніякай справы да стану вышэйшай адукацыі ў рэспубліцы. Нават імя Леніна, якое прысвоена універсітэту, не расчуліла нашых суседзяў, у адрас якіх мы пішам петыцыі амаль на працягу пятнаццаці гадоў. Пафас і справядлівы боль гэтых зваротаў мог бы пераканаць любога капіталіста, і той ахвяраваў бы тое-сёе на святую справу, але толькі не нашу наменклатуру.

Ва ўмовах, калі трэба дбаць пра пашырэнне спецыялізацый на філфаку, яго беларусізацыю, калі перад філфакам стаіць праблема пошуку свайго нацыянальнага аблічча, факультэт не ў стане вырашаць свае прафесійныя задачы, бо пазбаўлены элементарных умоў для працы. Ніхто з загадчыкаў кафедраў не мае кабінета, адзіны пакойчык, адведзены кафедры, выкарыстоўваецца пераважна як вучэбная аўдыторыя: тут ідуць заняткі, прымаюцца залікі, экзамены, а ў гэты час лабаранткі друкуюць планы і справаздачы... Кансультацыі праводзяцца ля вакна на калідоры... Аўдыторыі немагчыма праветрыць...

